№ 45 (542)
Снежань 2014 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года bfk.by

У нумары:

☞ Рэгіён: *юбілеі вёсак Асіповіцкага раёна –* *стар. 2*

☞ Трагічная старонка: *расстрэл яўрэяў у Стаўбцоўскім раёне –* *стар. 5*

☞ Дыскусійнае: *у пошуках нацыянальнай ідэі –* *стар. 6*

На тым тыдні...

✓ **27 лістапада** ў мастацкай галерэі ГА «Беларускі саюз мастакоў» у Палацы мастацтва адкрылася **IV Біенале жывапісу, графікі і скульптуры «Формазмест-703»**.

Гэта ўжо даволі паспяховы мастацкі праект, які дазваляе прааналізаваць асноўныя тэндэнцыі беларускага мастацтва. Экспазіцыю біенале склалі больш за пяцьсот карцінаў і скульптураў, створаных беларускімі мастакамі за апошнія два гады.

✓ **27 – 29 лістапада** ў Гродне прайшло **свята класічнай музыкі «TyzenHouse»**, што ўпершыню адбылося ў мінулым годзе. Яно прысвечанае Антонію Тызенгаўзу, старасце і мецэнату, пры якім у горадзе былі пабудаваныя мануфактуры, створаны батанічны сад, медыцынская школа, тэатр і тэатральная школа, музычная капэла, вядомая ва ўсёй Еўропе.

Цягам трох дзён у Гродне адбыліся канцэрты музыкаў з сусветнымі імёнамі – іспанскага скрыпача, уладальніка міжнародных узнагародаў Хесуса Рэйна; кітайскай віяланчэлісткі з Германіі Джынг Джыя, якая грае на інструменце Страдывары; маладога беларускага піяніста, пераможцы шматлікіх міжнародных конкурсаў, ураджэнца Гродна Кірылы Кедука (ён з'яўляецца таксама ініцыятарам і арганізатарам свята) ды іншых.

✓ **28 лістапада** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася **імпрэза «Святло яго душы»**, прымеркаваная да 115-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Міхася Лынькова. Ён належыць да таго пакалення, на вачах якога адбываліся найбольш знакавыя падзеі XX стагоддзя. М. Лынькоў прайшоў чатыры вайны: грамадзянскую, савецка-польскую, савецка-фінскую, Вялікую Айчынную. Яркія моманты тых часоў знайшлі адлюстраванне ў яго творчасці.

Варта дадаць, што за плённую працу пісьменнік быў узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. Заслугі М. Лынькова перад беларускай літаратурай адзначаныя званнем народнага пісьменніка Беларусі (1962), а таксама Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Якуба Коласа (1968) за раман «Векапомныя дні».

✓ **28 лістапада** адбылася **прэзентацыя кнігі Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне»**, перакладзенай на рускую мову.

Пад час мерапрыемства ўвазе прысутных быў прадстаўлены кароткаметражны гульнёвы фільм «Рускі», зняты рэжысёрам Віктарам Аслюком (кінастудыя «Беларусьфільм») па матывах аднайменнага апавядання М. Гарэцкага. Фільм прымеркаваны да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Былі згаданыя пад час вечарыны і гераічныя старонкі жыцця пісьменніка.

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Імпрэза

Да 55-годдзя Дома-музея Якуба Коласа

Сёлета 4 снежня споўнілася 55 гадоў з дня адкрыцця Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Музей паэта быў створаны пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 16 жніўня 1956 года, адкрыты ў доме, дзе жыў Якуб Колас з сям'ёй з 1944 па 1956 год, да моманту сваёй смерці. Сёння будынак музея – гісторыка-культурная каштоўнасць нашай краіны. У яго фондах захоўваюцца 34 тысячы музейных прадметаў, сярод якіх дакументы і матэрыяльныя рэліквіі, звязаныя з жыццём, творчасцю і грамадскай дзейнасцю Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча.

Дом Якуба Коласа пры яго жыцці быў своеасаблівым цэнтрам духоўнага жыцця сталіцы, дзе панавала творчая і сяброўская атмасфера. Тут частымі гасцямі былі вядомыя пісьменнікі, мастакі, артысты, музыкі, вучоныя і палітыкі. Таму пры адкрыцці музея яго стваральнікі на чале з сынам песняра і заснавальнікам установы Данілам Міцкевічам пастараліся захаваць тое асаблівае пачуццё цеплыні і зычлівасці, якія існавалі пры жыцці паэта.

На працягу 55-і гадоў зменена чатыры экспазіцыі, чацвёртая, найбольш поўная, адкрыта ў 2003 годзе. У 2014-м яна дапоўненая сучаснымі інтэрактыўнымі комплексамі і гукавой інсталяцыяй. На мемарыяльнай сядзібе створаны «Паэтычны куток Песняра», дзе ўсталяваныя драўляныя скульптуры герояў знакамітых твораў Якуба Коласа. Кажуць, каб адчуць душу паэта, трэба пабываць на яго радзіме. Акінчыцы, Альбуць, Ласток, Смольня – чатыры мемарыяльныя сядзібы на Стаўбцоўшчыне, родным кутку паэта – сёння сталі ўкрасай не толькі стаўбцоўскага краю, але годна прадстаўляюць музейны свет Беларусі на ўсю краіну і за яе межамі.

При Якубе Коласе ў доме панавала творчая атмасфера. Гэта традыцыя захоўваецца і сёння. Праводзяцца шматлікія мерапрыемствы з удзелам вядомых дзеячаў літаратуры, мастацтва, навукоўцаў. Імпрэзы заўсёды выклікаюць інтарэс у шырокіх колаў грамадскасці – ад школьнікаў да аматараў творчасці Якуба Коласа сталага ўзросту. Сёння Дом Коласа – годная візітная картка музеяў літаратурнага профілю нашай краіны.

Юбілей адзначаны шматлікімі мерапрыемствамі. Пад час святочных урачыстасцяў адбылася дзелавая сустрэча з кіраўнікамі ўстановаў, якія носяць імя Якуба Коласа, былі абмеркаваныя актуальныя пытанні па ўшанаванні памяці народнага паэта, далейшым развіцці і ўдасканаленні формаў папулярызацыі творчасці Песняра.

Таксама адбыўся ўрачысты вечар **«І песня, і жыццё...»**, дзе прысутнічалі родныя Якуба Коласа, былыя супрацоўнікі музея, кіраўнікі ўстановаў культуры і ўстановаў, якія носяць імя паэта, дырэктары літаратурных музеяў Расіі, Літвы і Украіны, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. Завершыўся ён канцэртнай праграмай.

Паводле інфармацыі музея

Рэгіён

Вёскі-юбіляры Асіповіччыны

З годна з кнігай «Памяць», сёлета круглую дату святкуюць такія паселішчы Асіповіцкага раёна: Дзераўцы, Ясень – 490 гадоў, Радуцічы – 465, Вязаўніца – 420, Амінавічы – 400, Лазовае, Пагарэлае, Верхі і Паплавы – 375, Знаменка – 200, Смык – 170, Прудок – 140, Дубралева, Осава і Ставішча – 105.

Аднак у кнізе «Нарысы па гісторыі Асіповіцкага раёна», выдадзенай у Мінску ў 2005 годзе пад рэдакцыяй кандыдата гістарычных навук В. Вяргея, ёсць і звесткі аб ранейшым існаванні гэтых вёсак.

Вядома, што ў 1838 годзе **сяло Дзераўцы** належала князю Л. Вітгенштэйну. Пазней арандаваў памешчык Бокша. З 1909 года ў Замошскай воласці. Да 1917 года тут дзейнічала народнае вучылішча. Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі было ператворанае ў працоўную школу 1-й ступені. Цяпер у Дзераўцах жыве 40 чалавек. Прыкладна столькі ж было і сто гадоў таму.

Ясень было вядомае як шляхецкае сяло. У 1579 годзе тут стаяла царква, у 1824 годзе замест старажытнага пабудаваны новы праваслаўны храм. У сярэдзіне XIX стагоддзя належала памешчыку Лойку. У 1897 годзе – у складзе Замошскай воласці. Знаходзіўся хлебазапасны магазін, вінная лаўка, млын. У 1907 годзе запрацавала народнае вучылішча, у якім настаўнічаў Фёдар Дубоўскі. У 1922 годзе адкрытая хата-чытальня. З 1954 – цэнтр сельсавета.

У XVI стагоддзі **Радуцічы** – дзяржаўнае сяло ў Глускай воласці. У 1797 – уласнасць Дамініка Радзівіла. У 1844 – цэнтр маёнтка Радуцічы, сумеснага ўладання Бокшаў і Вітгенштэйнаў. На пачатку XX стагоддзя дзейнічалі заезны двор, хлебазапасны магазін. Было прыкладна 800 жыхароў. Цяпер – у тры разы менш.

Вязаўніца ў 1594 годзе ўваходзіла ў склад памешчыцкага маёнтка Жыцін. З 1897 года – у Пагарэльскай воласці. Існавала сукнавальня, вадзяны млын, хлебазапасны магазін, пачатковая школа. Колькасць жыхароў – прыкладна 600, сёння – крыху больш за 400. Радзіма Героя Савецкага Саюза Яўгена Міхайлавіча Стэльмаха.

Таксама прыватнасцю маёнтка Жыцін былі і **Амінавічы**. У сярэдзіне XIX стагоддзя уласнасць Вітгенштэйнаў. Працавалі хлебазапасны магазін і царква. У 1917 годзе жылі 551 чалавек, цяпер – 45. Тут нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Мікалай Піліпавіч Каралёў.

Спачатку **Лазовае** і **Пагарэлае** былі вядомыя як урочышчы. У 1886 годзе апошняя стала цэнтрам воласці і праваслаўнага прыхода Ігуменскага павета, дзе існавала царква, былі царкоўна-прыходская школа, народнае вучылішча, ветраны млын, піцейны дом. У час грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі дзейнічаў валасны рэўкам. У Пагарэлым існаваў сельсавет, а землі належалі калгасу «Камунар».

Верхі і **Паплавы** раней знаходзіліся ў Замошскай воласці, у нашыя дні – гэта тэрыторыя Пратасевіцкага сельсавета. У 1917 годзе – 171 і 257 жыхароў адпаведна. Цяпер – 7 і 51 адпаведна.

Да 1864 года **Знаменка** была вядомая як ***Кабылянка***. У 1814 годзе пабудаваная царква. Вёска належала памешчыкам Есманам. У 1917 годзе дзейнічала народнае вучылішча і было 328 жыхароў, сёння – блізу 40.

У 1844 годзе **Смык-Слабада** – маёнтак Вітгенштэйнаў. Недалёка ад вёскі знаходзяцца гарадзішча і 2 селішчы. Тут жывуць 72 чалавекі.

Прудок узнік як паселішча ў 1874 годзе з пачаткам будаўніцтва паравознага дэпо, дзе былі пабудаваныя грэбля, сажалка і вадакачка для запраўкі паравозаў вадой. Цяпер тут 53 жыхары.

Дубралева – былы засценак Жыцінскай, вёскі **Осава**, **Ставішча** – Замошскай воласці. У 1917 годзе ў іх жылі 133, 53 і 113 чалавек адпаведна. Цяпер – 4, 177 і 30 адпаведна. Апошняе паселішча ў гады вайны было часткова знішчанае фашыстамі.

Ніна ВІКТОРЧЫК,
педагог, журналіст, краязнаўца

Невядомы помнік

Мала хто з мінчукоў ведае, дзе ў Мінску ёсць помнік Караткевічу. І гэта не Усходнія могілкі, дзе ўсталяванае надмагілле, а мікрараён Кунцаўшчына, у якім месціцца будынак гімназіі № 4 імя У.С. Караткевіча (вул. Кунцаўшчына, 18).

Гіпсавы помнік Уладзіміру Сямёнавічу атрымаў сталую прапіску ў бібліятэцы гімназіі менавіта ў юбілейным 2010 годзе, калі краіна адзначала 80-я ўгодкі класіка. Эскіз выявы студэнта Караткевіча быў падрыхтаваны скульптарам Гэнікам Лойкам да конкурсу помніка ў Кіеве. Але перамога дасталася Канстанціну Селіханаву, і яго праца была ўсталяваная ў сталіцы Украіны ў 2011 годзе.

Да двух помнікаў у Беларусі (у Віцебску і Оршы) у 2010 – 2011 гадах планавалася далучыць і помнік у Мінску. А пакуль сталічныя ўлады чакаюць чарговага юбілею, Г. Лойка зрабіў мінскім прыхільнікам таленту Караткевіча свой шчодры падарунак.

Малады ўзнёслы пісьменнік штодня сардэчна сустракае дапытлівых гімназістаў, якія далучаюцца да крыніцы кніжных ведаў.

Кожны год да дня яго народзінаў бібліятэка рыхтуе выстаўку твораў Караткевіча, а сёлета з кветкамі завітаў і сам скульптар.

Вельмі спадзяемся, што неўзабаве знойдзецца фундатар на паўнавартасны бронзавы помнік, які ўсталююць у гімназічным дворыку. Там дзеткі разам з Караткевічам будуць праводзіць ганаровыя лінейкі ды іншыя ўрачыстасці.

Наш карэспандэнт
Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Беларускі капітан

Нядаўна музеі сярэдняй школы № 3, што ў Мёрах, наведала Зофія Алейка з Грабаўніцы Старжэньскай. Пад час сустрэчы гаворка зайшла пра нашых славутых землякоў. Калі мы ўзгадалі імя капітана Мамерта Станкевіча, мая суразмоўніца паабяцала даслаць кнігу пра яго, што вельмі папулярная ў Польшчы. І слова сваё пані Зофія стрымала. Мы атрымалі ад яе кнігу Караля Ольгерда Борхарда (1905–1986) «Значыць Капітан». Караль Борхард – марскі афіцэр, ён служыў на акіянскім лайнеры «Пілсудскі» пад камандай капітана Станкевіча. Яму пашчасціла выжыць пры затапленні карабля пад час Другой сусветнай вайны. У кнізе аўтар з захапленнем апісвае майстэрства капітана, яго мужнасць і кемлівасць. У аснову назвы выдання было пакладзенае знакамітае прыслоўе капітана «Значыць».



Кніга Борхарда была напісаная яшчэ ў 1960 годзе, яна карысталася вялікай папулярнасцю і шмат разоў перавыдавалася. Па выніках апытання чытачоў яна была прызнаная лепшай кнігай з раздзела «Марыністыка». Для нас маюць цікавасць і шматлікія фотаздымкі нашага земляка, змешчаныя ў кнізе Борхарда.

Вітаўт ЕРМАЛЁНАК,
настаўнік гісторыі СШ № 3 г. Мёры

Індывідуальная падпіска – **Індэкс 63320**

1 месяц	20 000 руб.
3 месяцы	60 000 руб.
6 месяцаў	120 000 руб.

Ведамасная падпіска – **Індэкс 633202**

Ідзе падпіска на 2015 год. Не адкладайце на апошні дзень. Будзьма разам, сябры!

Школа з далёкага 1864-га

(Заканчэнне. Пачатак у № 44)

Пра тое, хто кіраваў школай у першыя пасляваенныя гады, дакладна невядома, але ў 1951 – 1957 гг. яе ўзначальваў Васіль Шыпінскі. Пры ім школа зноў стала сярэдняй і ў 1952 г. атрымала ўласны будынак. Потым два гады школай кіраваў Фёдар Сцепаненка, а з 1959 да 1964 г. – Уладзімір Маслёнчанка. З 1964 да 1978 г. дырэктарам Нісімкавіцкай СШ працаваў яе выпускнік Аляксандр Вайцянкоў. Праўда, быў перапынак у 1973–1975 гг., калі ён быў загадчыкам Чачэрскага раённага аддзела адукацыі. На жаль, нікога з названых кіраўнікоў школы ўжо няма сярод нас.

У 1973–1975 гг. школай кіраваў Уладзімір Паўлючэнка, у гэты час школа займела новы будынак, дзе яна месціцца і цяпер. У наступныя гады на пасадзе дырэктара школы працавалі Т. Крупенькіна, А. Мікша, У. Батурын, Н. Вайцянкова, У. Падабедаў, Л. Мелашчанка, Н. Батурына, Л. Цеплякова. Некаторы час выконваў абавязкі дырэктара школы і аўтар гэтых радкоў.

За сто пяцьдзясят гадоў існавання школы ў ёй працавалі сотні настаўнікаў. Многія пакінулі пасля сябе добрую памяць – гэта І. Лізюкоў, С. Хількевіч, А. Вайцянкоў, пра якіх мы ўжо згадвалі. Вядомы паэт Міхась Башлакоў пасля заканчэння Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1973 – 1974 гг. выкладаў у школе нямецкую мову і рускую літаратуру.

За тыя гады, калі школа была сярэдняй, яе скончылі больш за 1400 чалавек, не менш іх было і ў папярэднія гады. Сярод выпускнікоў – настаўнікі і ўрачы, вучоныя і вайскоўцы, інжынеры і аграномы. Вось некалькі імёнаў тых, кім ганарыцца школа.

П. Лізюкоў ў 1923 г. закончыў 5 класаў Нісімкавіцкай працоўнай школы 1-й ступені, працягваў адукацыю ў Чачэрску і ў Ленінградскай артылерыйскай школе імя Чырвонага Кастрычніка. Быў камандзірам артылерыйскага дывізіёна, знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка, брыгады. 30 студзеня 1945 г. Пётр Ільіч загінуў, пасмяротна яму прысвоенае званне Героя Савецкага Саюза.

Будынак школы з 1975 г.

Уладзімір Пархоменка закончыў Нісімкавіцкую сярэднюю школу ў 1958 г., вучыўся ў Гомельскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя В.П. Чкалава. Быў настаўнікам матэматыкі ў нашай школе, працаваў у Дзяржкамітэце БССР па прафтэхадукацыі, у Савеце Міністраў БССР, з'яўляўся намеснікам Міністра народнай адукацыі БССР, дырэктарам Беларускага навукова-даследчага інстытута адукацыі. Цяпер выдае часопіс «Шчаслівая сям'я».

Аляксандр Балігатаў скончыў школу ў 1971 г. і паступіў у Вольскае вышэйшае ваеннае вучылішча тылу, з адзнакай і залатым медалём закончыў Ваенную акадэмію тылу і транспарту. Быў намеснікам Міністра абароны па тылу, мае званне генерал-маёра.

Віктар Маркін пасля заканчэння ў 1977 г. школы паступіў у Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча супрацьпаветранай абароны, цяпер працуе ў Расіі.

Святлана Паходава ў 1973 г. закончыла 8 класаў Нісімкавіцкай сярэдняй школы і паступіла ў Віцебскі тэхнікум лёгкай прамысловасці. У 1983 г. была прынятая на службу ў органы ўнутраных спраў на пасаду начальніка раскройнага цэху Гомельскай жаночай калоніі. Цяпер палкоўнік унутранай службы С. Паходава з'яўляецца начальнікам жаночай калоніі № 4 у Гомелі, яна адзіная жанчына-палкоўнік у Гомельскай вобласці.

8 лістапада ў школе адбыліся ўрачыстасці з нагоды яе 150-годдзя. Цяперашні калектыў настаўнікаў і вучні сустрэліся з колішнімі выпускнікамі і настаўнікамі.

Аляксандр ГАНЧАРОЎ,
выпускнік Нісімкавіцкай СШ
1968 года

Фотаздымкі з архіва школы і выпускнікоў

З пункту гледжання гістарыяграфіяў і ідэнтычнасцяў

(Заканчэнне. Пачатак у № 44)

Толькі распад Савецкага Саюза ўмажлівіў радыкальны адыход ад савецкай масквацэнтрычнай канцэпцыі гісторыі краю. З абвяшчэннем суверэнітэту Рэспублікі Беларусь перад гістарыяграфіяй незалежнай дзяржавы паўстала задача абвяржэння вялікадзяржаўных расійскіх ды польскіх міфаў і стварэння сваёй канцэпцыі гісторыі, якая спрыяла б умацаванню беларускай ідэнтычнасці. Пераінтэрпрэтацыя мінулага неабходная для сцвярджэння сваёй калектыўнай ідэнтычнасці, выключэння з яе іншых, аддзялення ад іх. У недалёкім мінулым метады міфалагізацыі гісторыі з мэтай мабілізацыі масаў ды іх кансалідацыі вакол нацыянальнай ідэі выкарыстоўваліся і ў Расіі, Польшчы ды Літве. У беларусаў, найбольш запозненых у нацыянальным развіцці, патрэба гераізацыі гісторыі і гістарызацыі ўласнага грамадска-палітычнага жыцця была асабліва вострай. У гэтай сувязі імкненне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі да стварэння міфаў, якія задавальнялі б патрэбы развіцця дзяржавы і нацыі, можна лічыць з'явай тыповай і характэрнай.

Адным з найбольш эфектыўных спосабаў абуджэння нацыянальнай свядомасці заўжды было акцэнтаванне канфліктаў з «іншымі», гістарычных прыкладаў адпору захопнікам і асімілятарам. І паколькі Вялікаму Княству Літоўскаму, якое ў новай беларускай гістарыяграфіі стала «сваім», давялося найбольш ваяваць з Маскоўскай дзяржавай, канфлікты з Расіяй занялі асаблівае месца на старонках гістарычных выданняў незалежнай Беларусі. У тым кантэксце бітва пад Оршай мела ўсе шансы стаць цэнтральным сюжэтам гісторыі супрацьстаяння Беларусі і Расіі – і яна стала ім.

Інтэрпрэтацыя ў гістарыяграфіі незалежнай Беларусі

У школьных падручніках па гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь упершыню даўняя палітыка Масквы ў дачыненні да Беларусі была названа «адкрытай агрэсіяй», а войнам пачатку XVI ст. прысвячаўся асобны параграф, красамоўна названы «Абаронай незалежнасці» (гл. дапаможнік П. Лойкі). Галоўнае месца ў ім атрымала бітва 1514 г., ацэненая як «вялікая перамога» воінаў, якія «баранілі незалежнасць сваёй дзяржавы, свае хаты і сем'і». Вучням прапаноўваўся і фрагмент песні XVI ст., якая ўслаўляла князя Астрожскага, так што разам «аршанскі» эпізод заняў каля дзвюх старонак падручніка! Паказальна, што і ў акадэмічнай гістарыяграфіі Беларусі пачатку 1990-х гг., што ўзяла на сябе і нацыянальна-асветніцкія задачы, выкладаліся тыя ж погляды на беларуска-расійскія адносіны XVI ст. У першай акадэмічнай сінтэзе, створанай у Беларусі пасля распаду СССР (1994), бітва пад Оршай трактавалася з тых жа пазіцыяў і з такім жа патрыятычным пафасам, як у цытаваным вышэй школьным падручніку.

Хоць спецыяльнага манаграфічнага даследавання Аршанскай бітвы ў Мінску не з'явілася, беларускія гісторыкі ў першыя гады незалежнасці выступілі з дзясяткам навукова-папулярных публікацыяў у выглядзе артыкулаў і брашураў, у якіх вызначылася даволі звязная нацыянальная трактоўка падзеі.

Зразумела, у інтэрпрэтацыі беларускіх аўтараў акцэнтаваліся тыя моманты, якія дазвалялі максімальна звязаць бітву з беларускай гісторыяй, так бы мовіць, «прыватызаваць» яе. Перш за ўсё ў іх падкрэсліваліся: абарончы характар бітвы, значная або нават пераважальная прысутнасць беларусаў у арміі Астрожскага, ашаламляльнасць (грандыёзнасць) разгрому непрыяцеля, станоўчае ўспрыманне перамогі ў Беларусі і добрая памяць пра яе, урэшце – вялікае палітычнае і гістарычнае значэнне бітвы.

1. Абарончы, а значыць справядлівы характар бітвы заняў ключавую ролю ў беларускім гістарычным наратыве. Яна расцэньвалася як «вялікая перамога» беларускіх і літоўскіх воінаў, якія «баранілі незалежнасць сваёй дзяржавы, свае хаты і сем'і». Пафас абароны айчыны аднолькава характарызаваў як публіцыстычныя, так і навуковыя публікацыі. Патрыятызм воінаў Астрожскага, якія выйшлі абараняць «сваю зямлю ад спусташэння маскоўскіх войскаў», шэраг аўтараў называлі адным з фактараў іх перавагі ў няроўным міжбоі.

2. Адносна колькасці абедзвюх армій беларускія гісторыкі прынялі дадзеныя хронік, прызнаваныя звычайна і ў расійскай гістарыяграфіі: маскоўскія сілы налічвалі каля 80 тыс., тады як войска Астрожскага – не больш за 30 – 35 тыс. Важна было падкрэсліць значную прысутнасць у ім беларусаў, аднак крыніцы сведчаць, што больш за палову апошняга маглі складаць палякі, а сілы ВКЛ прадстаўляла шляхецкае рушанне ўсіх земляў гэтай дзяржавы. Таму некаторыя даследчыкі апускалі пытанне этнічнага складу арміі Астрожскага, іншыя імкнуліся ўзмацніць беларускі элемент ускоснымі аргументамі: напрыклад, выказвалася гіпотэза, што колькасць польскіх аддзелаў магла не перавышаць 4 тыс. Патрэбны эфект давала таксама расстаноўка адпаведных акцэнтаў пры апісанні бітвы, у якім галоўная роля адводзілася беларуска-літоўскай конніцы, тады як на польскую звярталася мала ўвагі, або адзначаліся даволі сімвалічныя рэчы: маўляў, прамова князя Астрожскага, звернутая да арміі перад бітвай, была «сказаная па-беларуску». Толькі зрэдку адкрыта гаварылася пра «праваслаўных беларусаў», якія складалі большасць пераможнага войска пад Оршай. Зразумела, праваслаўнае веравызнанне і гетмана, і часткі яго арміі стала істотным момантам беларускага наратыву, бо ён прынцыпова пярэчыў канцэпцыі «адзінай веры» як падставе «адзінага рускага народа».

Урэшце, яшчэ адзін аргумент, які фіксаваў сувязь арміі Астрожскага з сучаснай Беларуссю, быў знойдзены на славутай карціне невядомага мастака «Бітва пад Оршай»: вымпелы на дзідах воінаў мелі такое ж спалучэнне колераў, як беларускі нацыянальны сцяг, і былі названы «прадвеснікамі нашага гістарычнага бела-чырвона-белага сцяга».

3. Факт разгрому вялікай арміі захопнікаў значна меншай колькасцю абаронцаў быў, зразумела, выйгрышным для нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі. Таму беларускія гісторыкі падкрэслівалі грандыёзны характар разгрому непрыяцеля, часам прыводзячы з летапісаў яўна завышаныя дадзеныя пра колькасць забітых і палонных маскавітаў. Ускосна маштаб перамогі і слава Астрожскага мусілі адцяняцца тым, што пра яе «даведалася ўся Еўропа», і што яна была ўключаная ў хрэстаматыі па ваеннай гісторыі.

4. З пункту гледжання беларускіх гісторыкаў, пра станоўчае ўспрыманне перамогі над маскоўскай арміяй сведчылі народная песня аб бітве, пахвала князю Астрожскаму ў беларуска-літоўскім летапісе (праваслаўны летапісец дзякаваў гетману за тое, што «яго справаю... маскоўскага ворага пабілі...»), урэшце – памяць пра сечу, зафіксаваная ў карэспандэнцыі XVI ст., у якой у гераічным кантэксце нярэдка згадвалася «вялікая бітва Аршанская». Гістарычная беларуская песня «Слава Воршы ўжо ня горша», паходжанне якой у сапраўднасці невядомае, прыводзілася ў публікацыях пра бітву настолькі часта, што пра гэты твор даведалася найшырэйшая аўдыторыя, і ён стаў выконвацца бардамі і гуртамі.

5. Гаворачы пра значэнне бітвы, беларускія гісторыкі найчасцей бачылі яго ў блізкай перспектыве – у тым, што яна спыніла машабны наступ маскоўскай арміі ўглыб краю і дапамагла вызваліць ад яе гарады Усходняй Беларусі (Мсціслаў, Крычаў і Дуброўну). Іншымі словамі, яна хоць ненадоўга, але ўберагла Беларусь ад спусташэнняў маскоўскай арміі. Радзей адзначалася і стратэгічнае значэнне падзеі: што яна паспрыяла развалу небяспечнага ваеннага саюза Габсбургаў з Масквою, скіраванага супраць дынастыі Ягайлавічаў, дзякуючы чаму сарваліся планы антыягелонскай кааліцыі па перакройванні дзяржаўных межаў Усходняй Еўропы. Некаторыя аўтары лічылі магчымым надаваць бітве яшчэ большае значэнне, сцвярджаючы, што перамогай Астрожскага пад Оршай «быў абаронены суверэнітэт дзяржавы», г.зн. Вялікага Княства Літоўскага.

Адкрытая гісторыкамі для шырокай грамадскасці бітва пад Оршай стала адной з самых папулярных тэмаў перыядычнага друку. Вызваліўшыся ад савецкай сістэмы, якая навязліва пераконвала, што Беларусь – усяго толькі частка Расіі, беларусы ўспрынялі пераможную бітву 1514 г. як сатысфакцыю, убачылі ў ёй найважнейшы эпізод узаемаадносінаў з Расіяй. У сталіцы суверэннай Беларусі ў 1992–1994 гг. як у незалежных, так і ў дзяржаўных перыядычных выданнях, бітва адназначна ацэньвалася як «славутая старонка беларускай вайсковай гісторыі», называлася «слаўнай перамогай продкаў над войскамі маскоўскіх захопнікаў», з ёй звязваўся лёс Беларусі – бо яна надоўга ўратавала край ад уключэння ў склад Расіі і асіміляцыі. Перамога пад Оршай ацэньвалася і ў культурным вымярэнні. Пісалася, напрыклад, што калі б Канстанцін Астрожскі тады не спыніў наступ Масквы, то і першадрукар Францішак Скарына «наўрад ці змог бы вярнуцца на Радзіму ды распаўсюджваць свае выданні на Беларусі».

Наогул, у першай палове 1990-х гг. пра Аршанскую бітву ў Беларусі пісалі непараўнальна больш, чым пра якую іншую падзею даўняй гісторыі краіны. Падлікі паказваюць, што з 1992 г. колькасць публікацыяў пра бітву ў перыядычным друку кожны год падвойвалася і ў 1994 г. перасягнула 40 артыкулаў і нататак.

Невыпадкова дзень Аршанскай бітвы быў абраны для мерапрыемства вялікага грамадска-палітычнага значэння. Калі ў 1992 г. парламент Беларусі прыняў закон аб стварэнні беларускага войска, то былое савецкае афіцэрства байкатавала прысягу на вернасць Беларусі, апраўдваючы сваю пазіцыю тым, што прысяга даецца адзін раз, а яны, маўляў, прысягнулі Савецкаму Саюзу. І тады менавіта 8 верасня тысячы патрыятычна настроеных афіцэраў запасу сабраліся ў цэнтры Мінска на Плошчы Незалежнасці і распісаліся на прысяжных лістах – на вернасць Беларусі. Гэтае мерапрыемства і стала першым адзначэннем дня Аршанскай перамогі як «Дня беларускай вайсковай славы».

Генадзь САГАНОВІЧ, гісторык

(Урывак з артыкула «Аршанская бітва 1514 г. – канфлікт гістарыяграфій і ідэнтычнасцяў»)

Расстрэл яўрэяў на Стаўбцоўшчыне

Самотны лёс Беларусі... Няма такога стагоддзя ў яе гісторыі, якое б прайшло без войнаў, пажараў, крыві ды слёз. Дзве сусветныя вайны лютай віхурай пранесліся па зямлі беларускай, пакідаючы за сабой чорны след абгарэлых вёсак, маршчыны траншэяў ды шэрагі крыжоў над невялікімі насыпамі зямлі. Ці сціхне боль убачанага і перажытага? Кажуць, час лечыць. Аднак гэтая рана зноў і зноў вярэдзіць душу, прымушае вяртацца ў мінулае.

Даўно закончылася Другая сусветная вайна, ад мільёнаў людзей засталіся толькі іх імёны. Якімі яны былі, мы, напэўна, ужо ніколі не даведаемся. На помніку брацкай магілы каля вёскі Канкаловічы ёсць шыльда, а на ёй надпіс: «23 верасня 1942 года нямецкімі нацыстамі і іх наёмнікамі расстрэляны і закапаны жывымі 3 000 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці, мірных жыхароў горада Стоўбцы – мужчын, жанчын, дзяцей». Схілім галовы ў памяць аб іх трагічнай гібелі.

Працуючы ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, я знайшла дакументы, што тычацца расстрэлу яўрэяў на Стаўбцоўшчыне.

Дакумент з грыфам «абсалютна сакрэтна» датаваны 30.02.1943. Начальнік паліцэйскага аддзела старшы вахмістр Шульц дакладае: *«29 студзеня 1943 года мне данеслі, што ў гета лесапільнага завода ў Новым Свержані выстралам быў зняты часавы, і праз зробленую ў агароджы дзірку, скарыстаўшы цемру, збеглі каля 200 яўрэяў. Адразу ж быў выкліканы рэзервны батальён, і былі прыняты меры для пошуку ўцекачоў. Аднак вынікі беспаспяховыя. Яны раздзяліліся на дзве групы: адна пабегла на поўнач, другая – на поўдзень. Паўднёвая група, якую адшукалі паліцэйскім пунктам, пакінула сляды праз Гавязну да Пагарэлага. Потым сляды на санях павялі на Магільнае Койданаўскага раёна, і далей сляды згубіліся. Паўночная група, якую праследвалі запасным сапёрным батальёнам, згубіла след у вёсцы Апечкі. На пошуках частка яўрэяў, што збеглі, вернута ў лагер. У сувязі з гэтым прыняты шэраг мерапрыемстваў для ўмацавання аховы і па ўказанні».*

На падставе гэтых даследаванняў і шматлікіх паказанняў сведкаў устаноўлена, што нямецка-фашысцкія захопнікі за тры гады праводзілі арганізаванае знішчэнне савецкіх грамадзянаў. На тэрыторыі Стаўбцоўскага раёна яны знішчылі 4 828 чалавек, у тым ліку 1 909 жанчынаў і 1 169 дзяцей. Забілі і закатавалі сотні савецкіх ваеннаслужачых. Устаноўленыя месцы масавага пахавання яўрэяў: першая магіла знаходзіцца за два кіламетры ад райцэнтра ў лясным масіве вёскі Канкаловічы, другая – на тэрыторыі былога гета па былой вуліцы Паштовай у Стоўбцах. Пасля ўскрыцця апошняй былі знойдзеныя тысячы трупаў па-зверску расстраляных яўрэяў. Згодна з паказаннямі сведкаў, гэтыя людзі былі забітыя ў чэрвені 1941 года. У дзвюх магілах знаходзіцца 3 500 чалавек.

Архіўныя дакументы захоўваюць і такое данясенне: *«У сувязі з пабегам з гета яўрэяў лесапільнага завода ў пятніцу 29.01.1943 і 31.01.43 была праведзена аперацыя па знішчэнні яўрэяў у гета Навасвержанскага завода і Стоўбцах... Аперацыя па расстрэле яўрэяў, пачатая 31.01.1943, закончана. Засталіся толькі неабходныя і вельмі каштоўныя спецыялісты. На заводзе ў Новым Свержані – 12 чалавек, у Стоўбцах – 200 чалавек. У агульным ліку забіты 293 чалавекі абодвух полаў: мясцовага СД 31.01.43 усе яўрэі будуць расстрэляны. Начальнік паліцыі старшы вахмістр Шульц».*

Брацкая магіла каля в. Рубяжэвічы

З успамінаў жыхароў горада Стоўбцы аб трагічных падзеях

Эдуард Сяргеевіч Худушын (яго, на жаль, ужо няма побач з намі) успомніў такі выпадак: *«Я бачыў, як адзін чалавек у форме падышоў да маленькай дзяўчынкі, падняў яе, ударыў што ёсць сілы галавою аб борт машыны і кінуў на зямлю як непатрэбную рэч. Немагчыма было на гэта глядзець. Былі чутны стрэлы. Калі яўрэяў садзілі ў машыны, многія крычалі і плакалі, яны ведалі, што іх везлі на гібель».*

Валянціна Аляксандраўна Ціцюк: *«Яўрэяў вазілі дзень і ноч. Былі чутны крыкі і кулямётныя чэргі. Паставяць з краю рова, пусцяць чаргу, хто памёр, хто – не, усіх засыпаюць зямлёю. Яўрэяў вазілі ў брацкую магілу за горад».*

З успамінаў жыхаркі Новага Свержаня М.В. Гаўрыловіч: *«Толькі 22 чэрвеня, у нядзелю, пачулі па радыё аб нападзе фашыстаў, як ўжо праз пяць дзён былі ў вёсцы нямецкія матацыклісты. Праз некалькі хвілін расстралялі сям'ю пекара Пятровіча. Хутка ў сельскім Савеце размясцілася нямецкая камендатура, з'явіліся новыя законы, па якіх жыхары не мелі права выходзіць на вуліцу пасля 21 гадзіны. Немцы найбольш здзекаваліся з яўрэяў, якія складалі трэцюю частку жыхароў вёскі. На Мінскай і Нясвіжскай вуліцах жылі амаль адны яўрэі. Іх прымушалі нашываць жоўтыя кругі на адзенне, якія потым змянілі шасціканечныя зоркі. Гэтыя людзі мелі права хадзіць толькі пасярод вуліцы. Па Нясвіжскай вуліцы каля касцёла пабудавалі гета, абнеслі сцяною з трохметровых дошак, а зверху – калючы дрот у два рады і провад з токам. У хуткім часе ўсё яўрэйскае насельніцтва перасялілася ў гета. Жылі па 5 – 6 сем'яў у адным доме, галадалі. Калі ішлі працаваць на лесапілку ці на Мірскую гару пад канвоем, то стараліся памяняць свае рэчы на ежу. 2 кастрычніка 1941 года фашысты адабралі каля 30 самых маладых яўрэяў і пагнал іх на працу, а пасля – на яўрэйскія могілкі, дзе іх і расстралялі. Сярод гэтых людзей быў равін і нямецкі перакладчык Ісак Інзельбух. У канцы лістапада фашыстамі быў спланаваны масавы расстрэл. Яўрэяў у гета загрузілі на машыны, везлі на могілкі, клалі ў яму і расстрэльвалі. Потым крыху засыпалі пяском, і клалі другую партыю. Засыпаць яму прыгналі жыхароў вёскі. З гэтага часу яўрэі зразумелі, што адзіны выхад для выратавання – уцёкі. Яны сталі капаць падземны ход з прыбіральні да алешніка. Гэта недалёка ад цяперашняй школы. Уцякалі ў навагоднюю ноч 1943 года. Уратаваць сваё жыццё ўдалося 180 чалавекам. Астатнія не паспелі. Пасля гета было раскідана, яўрэяў перавезлі ў Стоўбцы, дзе ў хуткім часе расстралялі».*

Брацкая магіла ў ваколіцах в. Канкаловічы

Мармуровая пліта каля магілы непадалёк в. Новы Свержань

У лагеры смерці ў Новым Свержані ў гады вайны фашыстамі было закатавана каля 3 500 яўрэяў. На месцы расстрэлу на яўрэйскіх могілках ўсталяваны помнік ахвярам Халакосту, які даглядаюць вучні мясцовай школы. Пасля вайны колькасць яўрэйскага насельніцтва так і не аднавілася.

Святлана АДАМОВІЧ

Сёння мы друкуем роздум нашага пастаяннага аўтара на адну з актуальных тэмаў, звязанай з усведамленнем нас як адзінай нацыі (якая складаецца з многіх нацыянальнасцяў) на сваёй спаконвечнай тэрыторыі. Змяшчаем гэты артыкул з надзеяй, што нашыя чытачы далучацца да абмеркавання і выкажуць свае думкі пра няпростую праблему.

Аб народзе, нацыі і нацыянальнай ідэі

Народ, нацыя, нацыянальная ідэя – тыя паняцці, на сувязі між якімі трымаецца ўся сістэма каштоўнасцяў, сістэма права, сістэма стасункаў між чалавекам, грамадствам і дзяржавай у любой развітай сучаснай краіне. І не толькі ў краіне. Ад зместу, які чалавек у гэтыя паняцці ўкладае, залежыць і наш светапогляд, наша вера, наша жыццёвая пазіцыя. Таму важна адшукаць гэтых паняццяў сэнс, важна зразумець, што ў аснове яго ляжыць здольнасць да згоды, паразумення і разумных кампрамісаў у грамадстве і дзяржаве, якая з разнароднай супольнасці грамадзянаў, што часцей называем народам, і стварае нацыю. Нацыю, якая заўсёды ўсведамляе сваю нацыянальную ідэю, бо ж яна і з'яўляецца яе мэтай.

Як вядома, нацыі пачалі ўзнікаць у канцы XVIII – пачатку XIX стагодзя, з зараджэннем індустрыяльнага грамадства. Умоўна пачаткам гэтага працэсу можна лічыць Вялікую Французскую рэвалюцыю, якая ўпершыню ў сусветнай гісторыі ўсяму насельніцтву краіны дала грамадзянскія правы і свабоды, без якіх нацыя немагчымая ўвогуле. Я тут не буду спыняцца, чаму гэта так, гэта асобная тэма. Адзначу толькі, што для кансалідацыі грамадзянаў вакол нацыянальнай сістэмы каштоўнасцяў, якая і ляжыць у аснове ўзнікнення любой нацыі, неабходны шэраг перадумоваў. Да іх належаць фармаванне рэгіянальных (ці, як мы іх называем цяпер, нацыянальных) моваў і ўзнікненне даступнай літаратуры на іх, адукацыя насельніцтва, набыццё ім грамадзянскіх правоў і свабодаў, фармаванне грамадзянскай супольнасці, сацыяльная і тэрытарыяльная мабільнасць насельніцтва і іншыя. Адной з такіх перадумоваў з'яўляецца фармаванне нацыяналнай ідэалогіі, распаўсюджванне якой сярод насельніцтва пэўнай тэрыторыі ці краіны ў выніку нацыю і стварае.

І тут узнікае пытанне аб сутнасці ўсялякай нацыянальнай ідэалогіі, аб тым, што з'яўляецца яе мэтай, яе сэнсам. Іншымі словамі, узнікае пытанне аб нацыянальнай ідэі, якая ў аснове любой нацыянальнай ідэалогіі і ляжыць, робячы яе не наборам абстрактных поглядаў і меркаванняў, а цэласнай з'явай, што мае канкрэтную мэту.

Нацыянальнай ідэяй у любой нацыянальнай ідэалогіі з'яўляецца стварэнне ці ўмацаванне моцнай, незалежнай, заснаванай на нацыянальных каштоўнасцях, здольнай абараніць інтарэсы ўсіх сваіх грамадзянаў дзяржавы як таго інструмента грамадства, які толькі і здольны гэтую задачу паспяхова вырашаць

Тэарэтычна нічога складанага ў адказе на такое пытанне няма. Нацыянальнай ідэяй у любой нацыянальнай ідэалогіі з'яўляецца стварэнне ці ўмацаванне моцнай, незалежнай, заснаванай на нацыянальных каштоўнасцях, здольнай абараніць інтарэсы ўсіх сваіх грамадзянаў дзяржавы як таго інструмента грамадства, які толькі і здольны гэтую задачу паспяхова вырашаць. Менавіта кансалідацыя грамадзянаў вакол такой нацыянальнай ідэі, што з'яўляецца сутнасцю любой нацыянальнай ідэалогіі, і стварае нацыю. Да ўзнікнення такой кансалідацыі – гэта ўсё што заўгодна: народ, жыхары пэўнай дзяржавы ці тэрыторыі, этнас, народнасць ці нешта яшчэ, але не нацыя, у аснове якой заўсёды ляжыць сфармуляваная і ўспрынятая грамадствам нацыянальная ідэалогія і нацыянальная ідэя, што выцякае з яе.

Але проста гэта выглядае толькі ў тэорыі. На практыцы ж узнікае шмат пытанняў, на якія кожны з нас, нават не задумваючыся аб гэтым, дае свае адказы, заснаваныя на яго сістэме каштоўнасцяў, на яго разуменні народа, нацыі, нацыянальнай ідэі, дзяржавы і многага іншага, на ўзроўні развіцця яго свядомасці. Вось некаторыя з гэтых пытанняў. Што такое дзяржава? Што азначае незалежнасць дзяржавы? Ці павінна моцная дзяржава забяспечваць абарону сваіх грамадзянаў і ад сябе, і як гэтага дабіцца? Якую дзяржаву можна лічыць сучаснай і якія спосабы дасягнення ёю сваіх мэтаў і задачаў у канкрэтных абставінах з'яўляюцца дапушчальнымі? Ці ёсць нешта больш важнае для грамадства і дзяржавы, чым кансалідацыя грамадзянаў на падставе стваральных каштоўнасцяў і шляхі гэтай кансалідацыі? І такіх пытанняў шмат. Але гэтыя пытанні і адказы на іх – гэта ўжо іншая вялікая тэма, ахапіць якую ў межах гэтага артыкула немагчыма. Тут жа мне хочацца падкрэсліць, што менавіта ў нашых адказах на гэтыя пытанні заключаецца цяжкасць фармулявання намі таго паняцця, якое называецца нацыянальнай ідэяй. Іншымі словамі, цяжкасць фармулявання намі сэнсу нацыянальнай ідэі ў тым, якой канкрэтныя людзі, канкрэтныя палітычныя сілы ў грамадстве бачаць тую дзяржаву, у якой жывуць, да ўлады ў якой яны прыйшлі ці імкнуцца, гатовыя яны гэту дзяржаву ў інтарэсах умацавання нацыянальных каштоўнасцяў рэфармаваць ці імкнуцца захаваць усё як ёсць, кіруючыся ўласнымі інтарэсамі і мэтамі. Калі апошняе, то і ўзнікаюць размовы аб пошуках нейкага міфічнага міражу, які, як амерыканская мара, прыгожай казкай з чароўным канцом павінен аб'яднаць усіх. І тыя, хто ўпарта шукае тое, што знаходзіцца перад вачыма, не жадаюць разумець, што на нейкі час падмануць ці заблытаць людзей можна, але нічога трывалага і доўгачасовага на падставе зману стварыць нельга.

Падводзячы вынік папярэдняму, хочацца яшчэ раз падкрэсліць, што народ робіцца нацыяй там і тады, дзе і калі ўзніклае на яго падставе грамадства змагло сфармуляваць блізкую і зразумелую гэтаму народу, стваральную па сваёй сутнасці, нацыянальную паводле зместу сістэму каштоўнасцяў, а потым і аб'яднаць вакол яе грамадзянаў, стварыўшы тым самым тую духоўную супольнасць людзей, без якой нацыя немагчымая ўвогуле.

Змагла нацыянальная сістэма каштоўнасцяў, нацыянальная ідэалогія зрабіцца падставай духоўнай супольнасці грамадзянаў? Калі не – то чаму? Імкнецца створаная на падставе дадзенага народа і грамадства дзяржава зрабіцца адбіткам уласцівай ім нацыянальнай ідэі? Калі не – зноў чаму? Адкажыце на гэтыя пытанні. І калі будзеце шчырымі з сабой, зробіце правільную выснову, з'яўляюцца грамадзяне канкрэтнай дзяржавы, у тым ліку і Вашай, нацыяй, ці яны толькі жыхары нейкай краіны ці тэрыторыі, якім пакуль не хапае здольнасці зразумець, куды і навошта яны ідуць. А калі так – то ісці яны будуць доўга. Аб гэтым у самай вядомай Кнізе сказана, што людзі блукалі сорак гадоў па пустыні да той пары, пакуль не вытравілі з сябе псіхалогію раба, пакуль не змаглі аб'яднацца вакол адзінай для ўсіх мэты.

Блукаць народы будуць, пакуль людзі не вытравяць з сябе псіхалогію раба, пакуль не згуртуюцца вакол агульнай стваральнай мэты, пакуль, гаворачы сучаснай мовай, не зробяцца нацыяй, здольнай, на падставе пошуку ўзаемаразумення, згоды і кампрамісаў, паспяхова вырашаць няспынна ўзнікальныя перад любым грамадствам праблемы і супярэчнасці

А ці цяпер такіх народаў, якія блукаюць па пустыні, няма? Паглядзіце вакол, і пабачыць відушчы. І блукаць яны будуць, пакуль людзі не вытравяць з сябе псіхалогію раба, пакуль не згуртуюцца вакол агульнай стваральнай мэты, пакуль, гаворачы сучаснай мовай, не зробяцца нацыяй, здольнай, на падставе пошуку ўзаемаразумення, згоды і кампрамісаў, паспяхова вырашаць няспынна ўзнікальныя перад любым грамадствам праблемы і супярэчнасці.

У заканчэнні, зыходзячы з тэмы артыкула, хочацца зрабіць некалькі ўдакладненняў. Першае адносна паняццяў «нацыянальная ідэалогія» і «нацыяналізм». Многія іх аб'ядноўваюць, гаворачы, што гэта адно і тое ж. Мне ж здаецца, што гэтыя паняцці зусім не сінонімы. Пакуль мы расказваем прыгожыя легенды і казкі аб сваім народзе, пакуль услаўляем яго гісторыю і герояў, пакуль на гэтай падставе шукаем паразуменне і згоду – гэта нацыянальная ідэалогія. Але як толькі мы пачынаем абражаць, прыніжаць ці прыгнятаць іншыя народы ці нацыі, пачынаем разважаць аб іх абмежаванасці – гэта нацыяналізм. Другое. Цяпер шмат гавораць пра глабалізацыю, часта робячы выснову, што нацыянальная ідэалогія – ледзь не перажытак мінулага. Што на гэта адказаць? Калі коратка, у свеце няма нічога новага. Усё, што нам такім здаецца, – толькі добра забытая, узніклая на новай аснове, у новых гістарычных умовах, на іншым узроўні нашай свядомасці з'ява. Хіба Рымская імперыя (і не толькі яна) – не прыклад глабалізацыі для свайго часу? А сённяшняя нацыя – ці ж гэта не далейшае развіццё такіх з'яваў, як сям'я, род, племя, народнасць у новых сацыяльных, гістарычных і эканамічных умовах? На мой погляд, гэтыя з'явы, глабалізацыя і нацыя, зусім не супярэчаць адна адной, больш таго, адна адну дапаўняюць, калі людзям хапае здольнасці шукаць між сабой згоду і паразуменне. І апошняе. Калі пад нацыяй разумець, як робяць многія, не палітычную, а этнічную, заснаваную на еднасці «крыві», а не «веры», не на еднасці каштоўнасцяў супольнасць грамадзянаў, то гэта, у выніку, заўсёды прывядзе ў тупік, прывядзе да нянавісці, варожасці, разбурэння. Прыкладаў гэтага ў гісторыі дастаткова. Трэба толькі навучыцца рабіць з іх разумныя высновы. Трэба навучыцца разважаць.

Георгій ШЭЎМЕР, г. Мінск

«Нам няма чаго саромецца — мы жывем у Вялікім Княстве Літоўскім!»

Днямі пра гэта казаў Сяржук Доўгушаў, лідар гурта «Vuraj», пад час чарговага Спеўнага Сходу. Прафесійны музыка, на гэтых сустрэчах ён вучыць і заахвочвае спяваць традыцыйныя беларускія песні ўсіх, хто мае такое жаданне. Пад час папярэдніх сустрэчаў удзельнікі знаёміліся з фальклорнымі мелодыямі, а цяпер звярнуліся да іншага, не менш традыцыйнага пласта беларускай музыкі. Гэта былі спевы часоў Вялікага Княства Літоўскага з трох крыніцаў – бадай што культавага для беларускіх музыкаў «Полацкага сшытка» (вядомы таксама як «Астрамечаўскі сшытак»), «Аршанскага сшытка» і больш позняга зборніка вакальнай музыкі «Куранты».

Пра гісторыю стварэння гэтых музычных збораў, якія сведчаць аб тым, што пяць стагоддзяў таму беларусы слухалі ды выконвалі выбітныя музычныя творы, коратка распавёў С. Доўгушаў, а пазней – удзельнікі ансамбля старадаўняй музыкі «Кантабіле», якія таксама былі тым вечарам на Спеўным Сходзе. Іх прысутнасць на імпрэзе была зусім невыпадковай – менавіта ўдзельнікі ансамбля ўпершыню выканалі кампазіцыі з гэтага музычнага збору, пасля таго як рукапіс быў знойдзены ў Ягелонскай бібліятэцы Кракава прафесарам Адамам Мальдзісам.

І хаця, як казаў С. Доўгушаў, тагачасная культура спеваў вельмі рознілася ад сённяшняй, ды і выглядалі людзі па-іншаму, але, відаць, спрацоўвала гістарычная памяць, дапамагаючы вылучыць сваё, роднае і блізкае:

А ў полі рэчка,
Цераз рэчку кладка.
Не пакінь жа,
мой міленькі,
Не вялела матка...

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота аўтара

Запарожскі казак з Беларусі

Тыя, хто некалі чытаў гісторыю Запарожскага войска, несумненна, пазнаёміліся і з прыгодамі знакамітага разбойніка Сямёна Гаркушы, чые «подзвігі» наводзілі жах на багатых людзей Украіны. Але няшмат хто, напэўна, ведае, што гэты смелы і адчайны хлопец быў не ўкраінцам, а беларусам.

Сын Івана Нікалаенкі, прыгоннага селяніна пана Старынскага, ён нарадзіўся каля 1739 года ў палесскай вёсцы Беразань (цяпер Бярозава. – **В.А.**) Мазырскага павета. У дзевяць гадоў паступіў у прыходскую школу, але, правучыўшыся некалькі месяцаў, збег з роднай вёскі з купцом-запарожцам Якавам Легкаступам і, жывучы з ім у Запарожжы, дапамагаў таму гандляваць.

Праз восем гадоў стары Легкаступ памёр, і хлопец прадаў усю яго маёмасць за паўтары тысячы рублёў і прыйшоў у Сеч, дзе быў запісаны ў лік казакоў шкурынскага куреня. Казакі адразу ж далі Сямёну мянушку «Гаркуша» – Сямён моцна картавіў.

Разам з іншымі запарожцамі Сямён Гаркуша заняўся менавым гандлем па ўкраінскіх гарадах. У 1770 годзе ён прыняў удзел у Турэцкай кампаніі, быў з запарожцамі пад Ачакавам, а потым хадзіў пад Хаджыбей, дзе быў паранены. Пасля вяртання ў Запарожжа Гаркуша зноў заняўся гандлем, але ненадоўга, бо ў хуткім часе страціў усю сваю маёмасць. Аднойчы яму давялося ўпотай перайсці польскую мяжу. Сямён наткнуўся на кардонную варту і, каб не быць пасаджаным на кол ці павешаным, збег, пакінуўшы на месцы ўвесь свой тавар.

З гэтага часу Гаркуша стаў «ідэйным» разбойнікам: рабаваў багатых папоў, граміў начальства, спрыяў мужыкам «и таким образом являлся живым протестом против установившегося экономического порядка с притеснением крестьян помещиками и эксплуатацией казаков войсковой старшиной».

Абрабаваўшы разам са сваёй хеўрай вядомую багатую памешчыцу Сцепаніду Паркурыху, ён пакараў яе бізуном, каб «кос девкам не резала». Сустрэўшы ў Мгліне аднойчы тамтэйшага старасту, загадаў сваім разлажыць яго і адхвастаць «за то, что неправедно судит» і інш. Сваёй смеласцю і адвагай пры рабунках Сямён Гаркуша наганяў жах на памешчыкаў і ўлады, а спрыт і паваротлівасць, што не раз дапамагалі яму збегчы з астрога, акружылі яго ў народнай памяці арэолам героя. Расказвалі, што яго куля не бярэ і што ў яго ёсць разрыў-трава, якая ўсялякае жалеза разрывае.

Аднойчы ў Ромнах, па даносе аднаго калачніка, Гаркушу схапіла паліцыя. Ён атрымаў 280 удараў бізуном – па семдзесят за кожнае з чатырох здзейсненых ім у розных месцах злачынстваў – і з выразанымі да касцей ноздрамі быў сасланы на вечную катаргу ў Херсон. Там, відаць, і скончылася яго жыццё, бо далейшы лёс яго невядомы.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Наша суседка Латвія

Уздоўж

1. Назва рыжскага ансамбля беларускай народнай песні. **4**. Яніс .... Латышскі паэт, перакладчык, драматург, грамадскі дзеяч; неаднаразова наведваў Беларусь, сябраваў і перапісваўся з Янкам Купалам. **6**. «... ў Рызе». Карціна сусветна вядомага мастака, пісьменніка, грамадскага дзеяча, ураджэнца Ваўкавыскага раёна Вячкі (Вячаслава Міхайлавіча) Целеша, якую ён летась падарыў Беларусі; мастак больш за 50 гадоў жыве ў Латвіі, але часта наведвае сваю Бацькаўшчыну. **9**. ... Луцкевіч. Імя беларускага палітычнага і грамадскага дзеяча, краязнаўца, археолага, які вучыўся ў Мікалаеўскай гімназіі г. Лібавы (цяпер г. Ліепая). **10**. Полацкае .... Старажытнабеларускае ўладанне; у яго ўваходзілі землі ўздоўж Заходняй Дзвіны (Даўгавы) да самага ўпадзення ракі ў Рыжскі заліў; фарпостам Полацкага ... былі крэпасці Герцыке і Кукенойс, якія ўзначальвалі князі Вячка і Усевалад. **11**. Назва ракі ў Латвіі і найбуйнейшага нацыянальнага парку. **14**. Смерч над сушай. **15**. Збор дакументаў па якімнебудзь пытанні, асобе. **18**. ... Маўр (Іван Фёдараў). Вядомы беларускі пісьменнік, аўтар прыгодніцкіх твораў для дзяцей і моладзі; нарадзіўся ў Лібаве. **19**. ... Паўлс. Выдатны латышскі кампазітар, дырыжор, піяніст, аўтар многіх папулярных песень, быў міністрам культуры Латвіі; нарадзіўся ў Рызе. **22**. Інтэрнэт-дзённік, які рэгулярна дапаўняецца запісамі. **23**. Былая назва г. Даўгаўпілса, які раней належаў Беларусі і дзе нарадзіўся беларускі палітычны, грамадскі і ваенны дзеяч, публіцыст, педагог Кастусь Езавітаў. **24**. Старэйшы бальнеалагічны прыморскі курорт у Латвіі, які славіцца сваімі гаючымі мінеральнымі водамі. **25**. Касмічны .... Прыбор, прыстасаванне для даследавання космаса; у распрацоўцы савецкіх касмічных ... вялікі ўклад унёс галоўны тэарэтык савецкай касманаўтыкі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец Рыгі акадэмік Мсціслаў Келдыш.

Упоперак

1. Набуханне сокамі пладоў, зерня. **2**. Натуральны падатак у Рускай дзяржаве. **3**. Адзін з паверхаў у глядзельнай зале. **4**. Народны сход. **5**. Вертыкальны брус. **7**. Вацлаў .... Беларускі пісьменнік, гісторык, акадэмік, грамадскі і палітычны дзеяч, прэм'ер БНР; у 1919 г. жыў у Латвіі, дзе ствараў блок беларускіх партыяў, чытаў лекцыі на беларускай мове для настаўнікаў і творчай інтэлігенцыі, а ў сакавіку 1921 г. удзельнічаў у Рыжскай мірнай канферэнцыі. Расстраляны сталіністамі ў 1938 г. **8**. Горад, дзе ў часы Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў створаны сумна вядомы канцлагер «Куртэнгоф» для малалетніх вязняў, у якіх бралі кроў для нямецкіх салдатаў. **12**. Домскі .... Найбуйнейшы сярэднявечны храм Балтыі, сімвал Рыгі. **13**. ... Трох Зорак. Вышэйшая ўзнагарода Латвіі; кавалерам гэтай узнагароды з'яўляецца і наш зямляк Вячка Целеш, чалавек, які здолеў аб'яднаць беларусаў Латвіі. **16**. Кварцавы і шкляны .... Адзін з карысных выкапняў Латвіі. **17**. ... Буйніцкі. Беларускі акцёр, рэжысёр, стваральнік нацыянальнага беларускага тэатра; скончыў Рыжскае землямернае вучылішча. **19**. Рыжа-карычневы. **20**. Тое, што і кукуруза. **21**. Верхняя і ніжняя дошкі струннага музычнага інструмента.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



Снежань

10 – Старадарожскі музей выяўленчага мастацтва (Старыя Дарогі; 1990), прыватная ўстанова культуры – 15 гадоў з часу адкрыцця.

10 – Ланчыцкі Ланцыцій Мікалай (1574, каля Нясвіжа – 1653), рэлігійны каталіцкі дзеяч, публіцыст, педагог – 440 гадоў з дня нараджэння.

11 – Воінаў Анатоль Аляксандравіч (1934, Мінск – 1995), архітэктар, гісторык архітэктуры, педагог, заслужаны архітэктар Беларусі, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі архітэктуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980) – 80 гадоў з дня нараджэння.

12 – Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зьніч» Беларускай дзяржаўнай філармоніі (Мінск; 1989) – 25 гадоў з часу прэм'еры першага монаспектакля.

12 – Музей беларускага мастацтва (Раўбічы; 1979), філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь – 35 гадоў з часу адкрыцця.

12 – Завадскі Адам (1814, Вільня – 1875), друкар, які выдаў першую кнігу В. Дуніна-Марцінкевіча «Сялянка» (1846), друкаваў творы А.Б. Ехера, І. Ходзькі, Я. Чачота, Ю. Крашэўскага, У. Фялінскай, У. Сыракомлі – 200 гадоў з дня нараджэння.

12 – Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч (1924, Талачынскі р-н – 2003), крытык, літаратуразнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1966) – 90 гадоў з дня нараджэння.

12 – Шаблоўская Ірына Вікенцьеўна (1939, Мінск – 2004), літаратуразнаўца, аўтар працаў па праблемах кампаратыўнага вывучэння славянскіх літаратураў, развіцця чэшскай літаратуры, сусветнай літаратуры XX ст., гуманітарнай адукацыі ў Беларусі, узаемадзеяння беларускай славеснасці з літаратурамі народаў свету – 75 гадоў з дня нараджэння.

13 – Жолтак Валяр'яна Канстанцінаўна (1919, Жлобін – 2000), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1999) – 95 гадоў з дня нараджэння.

13 – Самбук Сусанна Міхайлаўна (1924, Расія – 2012), вучоны-гісторык, аўтар даследаванняў па гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. – 90 гадоў з дня нараджэння.

14 – Флароўскі Антоній Васільевіч (1884, Украіна – 1968), расійскі і чэшскі гісторык-славіст, даследчык жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны – 130 гадоў з дня нараджэння.

15 – Кананові Уладзімір Ільіч (1964, Клецк), вучоны-гісторык, аўтар працаў па гісторыі арыстакратыі ВКЛ, гістарычнай антрапалогіі, культурнай гісторыі Беларусі – 50 гадоў з дня нараджэння.

15 – Косак Фартунат Юліўш (1824, Польшча – 1899), польскі жывапісец, ілюстратар, аўтар шэрагу батальных карцінаў з гісторыі Польшчы і ВКЛ – 190 гадоў з дня нараджэння.

15 – Юдовін Саламон Барысавіч (1894, Бешанковічы – 1954), мастак, аўтар працаў у станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе – 120 гадоў з дня нараджэння.

16 – Анцімонаў Леанід Сяргеевіч (1934, Сенненскі р-н – 2012), графік, жывапісец, педагог, выдатнік народнай асветы Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

16 – Зьніч (сапр. **Бембель Алег Андрэевіч**, у манастве – **Іаан**; 1939, Мінск), паэт, публіцыст, філосаф – 75 гадоў з дня нараджэння.

16 – Юрашкевіч Алена Канстанцінаўна (1934, Мінск), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва – 80 гадоў з дня нараджэння.

19 – Мемарыяльны музей Я.Ф. Карскага (в. Лаша, Гродзенскі раён; адкрыты для наведнікаў у 1964 г., у 1995 г. пераведзены ў Гродзенскую гімназію № 1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага) – 50 гадоў з часу адкрыцця.

19 – Рыжыкаў Мікалай Максімавіч (1939 – 2012), мастак, аўтар працаў у станковай і кніжнай графіцы, акварэлі – 75 гадоў з дня нараджэння.

20 – «Беларуская хата» (Латвія; 1924), культурна-асветнае таварыства беларускай інтэлігенцыі – 90 гадоў з часу стварэння (існавала да 1936 г.).

20 – Фурс Вольга Мікалаеўна (1914, Пухавіцкі р-н – 1991), беларуская і расійская оперная спявачка, заслужаная артыстка Бурацыі – 100 гадоў з дня нараджэння.

21 – Ізаітка Анатоль Сяргеевіч (1954, Полацк), жывапісец, аўтар працаў у станковым жывапісе і графіцы – 60 гадоў з дня нараджэння.

21 – Нісневіч Ізідар Герасімавіч (1914, Мінск – 1977), музыказнаўца, музычны крытык, аўтар сцэнарыяў навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў – 100 гадоў з дня нараджэння.

21 – Чыгрынаў Іван Гаўрылавіч (1934, Касцюковіцкі р-н – 1996), пісьменнік, перакладчык, публіцыст, драматург, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1979), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974) – 80 гадоў з дня нараджэння.

22 – Юдзеніч Ніна Мікалаеўна (1924, Узбекістан – 2010), музыказнаўца, педагог, аўтар працаў па праблемах жанру і формы ў творчасці класікаў замежнай, рускай і сучаснай музыкі, даследчык творчасці беларускіх кампазітараў і музыказнаўцаў Л. Захлеўнага, Л. Мухарынскай, Л. Шлег і інш. – 90 гадоў з дня нараджэння.

24 – Алесь Дудар (сапр. Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч; 1904, Петрыкаўскі р-н – 1937), паэт, тэатральны крытык, перакладчык, адзін з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк» – 110 гадоў з дня нараджэння.

Гарбата ад «кветкавай» паэткі

Кася Сянкевіч – беларуская паэтка і мастачка з Польшчы – ужо з'яўляецца аўтаркай вершаванага зборніка «Дачка ружы», а нядаўна свет пабачыла яе новая кніга паэзіі «Гарбата з незабудак». Дзякуючы серыі «Кнігарня пісьменніка» і выдавецтву «Кнігазбор» творы Касі ўпершыню прадстаўленыя беларускім чытачам.

За кубачкам «Гарбаты з незабудак» Кася Сянкевіч у пранізлівых маналогах-споведзях разважае пра вечныя тэмы кахання, веры, пошуку свайго месца ў жыцці і сусвеце. Форма, абраная паэткай, – а менавіта верлібр – дазваляе знаходзіць найбольш дакладныя і змястоўныя мастацкія сродкі для выказвання самых тонкіх пачуццяў.

* * *

Гэтая справа
не для абмеркавання.
Прыгадай
апошнюю ўсмешку,
апошні наш сум.

Пра тое магла б быць
напісана паэма,
а ёсць толькі гэты
кароткі верш.

Паводле паведамлення прэс-службы ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

Хто курыць, таго да пекла тураць. Або да труны

Ізноў супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, кажучы пра пажары, нагадваюць, што асноўная частка іх адбываецца з-за курэння ў ложку, а таксама з-за нядбайнага абыходжання з цыгарэтамі і запалкамі.

Здаецца, што тут такога небяспечнага? Ну, стаміўся чалавек, а пасля напружанага працоўнага дня так добра прылегчы і закурыць, расслабіцца... Асабліва калі яшчэ выпіць перад гэтым колькі чарак. Аднак тытунь, што тлее, можа трапіць на пасцельную бялізну, а дым стане прычынай удушша раней, чым пажар заўважаць. Гэты страшны сцэнар з'яўляецца звыклым для пажарных, якія прыязджаюць па выкліку, але ўратаваць заўзятых курыльшчыкаў атрымліваецца далёка не заўсёды.

Пра небяспечнасць вышэйзгаданых шкодных звычак расказвалі супрацоўнікі МНС у межах акцыі «Не спальвай сваё жыццё!» Хочацца думаць, гэтыя прафілактычныя захады будуць мець плён.

Вера БУДЗІНАВІЧУС, інспектар ЦРАНС г. Мінска

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

НАРОДНАЯ МАРАЛЬ (*заканчэнне артыкула*). Адносна аднолькавае матэрыяльнае становішча, роўнасць узростаў маладых пры шлюбе, іх працавітасць і ўзаемнае каханне, фізічнае здароўе, добрыя і спагадлівыя дзеці – маральны ідэал сям'і беларуса. Выхаваць дзяцей – значыць даць ім магчымасць спасцігнуць жыццё праз працу без апекі. Непавага да старэйшага, тым больш да бацькоў – маральны грэх.

Для народнай маралі характэрная вялікая любоў да Радзімы. Спачатку яна атаясамлівалася з месцам, дзе чалавек нарадзіўся, пазней пад уплывам сацыяльна-эканамічных зменаў гэтае паняцце пашыраецца да межаў нацыі і ўсёй краіны. Разуменне народам Радзімы двухпланавае. Першае – гэта блізкія сэрцу хаты, родныя нівы, зялёныя дываны лугоў, шумлівыя лясы і рэкі, працавітыя добрыя людзі з іх спагадлівасцю і самаадданасцю ў барацьбе з агульным горам; але гэта і цяжкая праца на пана, здзекі над чалавекам і насілле, голад, галеча і несправядлівасць. Народ любіць не тую Радзіму, дзе пан пануе, а мужык гаруе, а тую, дзе бытуе праўда, знішчаныя зло, крыўда, дзе вольная праца і шчасце.

Патрыёт – гэта магутны ўладар і абаронца сваёй зямлі, які нялёгкай працай упрыгожвае яе, даглядае і любіць. Народная мараль – супраць захопніцкіх войнаў, але за гатоўнасць чалавека аддаць жыццё за лёс і шчасце Радзімы. Здрадніка, чужынца-захопніка народ пазбаўляе чалавечай годнасці, параўноўвае з самымі нізкімі і пачварнымі істотамі.

Народная мараль імкнулася да волі, свабоднай творчай працы, пазбаўленай прыгнёту. У XX ст. народаўладства стала той сілай, што ўсталёўвае паміж людзьмі і народамі чалавечыя, гуманістычныя стасункі. Народная мараль – бескарысны дар мінулых пакаленняў.

НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА – сукупнасць эмпірычна набытых народам ведаў пра лечачыя сродкі, лекавыя травы і гігіенічныя навыкі, а таксама іх практычнае выкарыстанне для збяражэння здароўя, папярэджання і лекавання хваробаў. Узнікла ў глыбокай старажытнасці.

У першабытнаабшчынным грамадстве была адзіным відам медыцыны, абагульняла звесткі пра пэўныя гігіенічныя меры і спосабы лячэбнай дапамогі пры пашкоджаннях, абмаражэннях, апёках, траўмах, розных хваробах. Збіранне і ўжыванне ў ежу раслінаў давала чалавеку магчымасць пазнаёміцца з іх уласцівасцямі, адрозніваць ядомыя плады, карані, травы, грыбы, водарасці ад неядомых, атрутныя – ад неатрутных, набываць веды пра ўздзеянне той ці інш. расліны на арганізм чалавека (напр., было заўважана, што адны расліны выклікалі павышанае сэрцабіццё, другія сунімалі кашаль і г.д.). З развіццём земляробства і жывёлагадоўлі веды чалавека пра раслінны і жывёльны свет пашырыліся. Так, пры апрацоўцы скуры людзі даведаліся пра вяжучыя ўласцівасці дубовай і вярбовай кары і пачалі выкарыстоўваць адвары яе пры страўнікава-кішэчных хваробах. Алей, выціснуты з семя лёну, сланечніку і канапель, служыў слабільным сродкам, а распаранае льняное семя – сродкам для прыпарак. Здаўна ад курынай слепаты елі ялавічную (цялячую) печань, ад цынгі – цыбулю, часнок, чарамшу і хрэн, ад малакроўя – моркву і грэцкую кашу. Малакроў'е лячылі таксама сокам альяса, сухоты – рысіным, сабачым, барсуковым, рыбіным ці мядзведжым тлушчам. З старажытнасці вядомыя гаючыя ўласцівасці сонечных прамянёў, вады, снегу. З назапашваннем ведаў па народнай медыцыне з'явіліся асобы, асноўным заняткам якіх стала лячэнне. У Кіеўскай Русі іх называлі лечцамі, зяленнікамі, траўнікамі.

(Заканчэнне артыкула будзе)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 04.12.2014
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 1020.
Тыраж 920 асобнікаў.